*С. А. Савік, кандыдат гістарычных навук, дацэнт*
*М. І. Капковіч, начальнік цыкла кафедры тактыкі і агульнавайсковай падрыхтоўкі*
*БНТУ, г. Мінск*

# ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ ПРА ВЯЛІКУЮ ПЕРАМОГУ ЯК ФАКТАР БАРАЦЬБЫ З МІФАМІ ЗАХОДНЯЙ ІДЭАЛОГІІ

ХХ стагоддзе прынесла чалавецтву дзве сусветныя і сотні лакальных войнаў. Другая Сусветная вайна пакінула асабліва цяжкі след у гісторыі, менавіта таму прычыны, якія прывялі да яе, у заходняй гістарыяграфіі і літаратуры імкнуцца сказіць, прадставіць у сваім святле. Глыбінныя карані сусветных войнаў крыюцца ў сацыяльна-эканамічнай сістэме імперыялізму, якая непазбежна выклікае барацьбу за крыніцы сыравіны і рынкі збыту: у Першай сусветнай вайне ў мэтах перадзелу каланіяльных уладанняў двух блокаў вядучых дзяржаў і ў Другой сусветнай вайне – ужо за сусветнае панаванне. Мілітарызм працяў грамадскае жыццё – вытворчасць зброі, а адсюль і войны, сталі «выгадным бізнэсам».

Сутнасць фашызму ХХ стагоддзя – гэта найбольш рэакцыйная тэрарыстычная дыктатура буйнога капіталу, таталітарны імперыялізм, які імкнецца да сусветнага панавання. Ідэалогія фашызму – расізм разам з антыкамунізмам. Свая нацыя аб'яўляецца «вышэйшай расай», прызначанай панаваць над нібыта «непаўнавартаснымі» народамі (вось як выказаўся А. Гітлер на адным з абедаў з нацысцкім кіраўніцтвам: «Славяне створаны для таго, каб працаваць на немцаў, і ні для чаго больш, наша мэта – пасяліць у месцах іх цяперашняга пражывання 100 мільёнаў немцаў. ... Мы возьмем сабе толькі лепшыя іх землі, а ў балотах хай калупаюцца славянскія абарыгены. ... Трэба разумець, што ад пісьменнасці рускіх, беларусаў, украінцаў і ўсякіх іншых толькі шкода, заўсёды знойдзецца пара светлых галоў, якія звернуцца да вывучэння сваёй гісторыі, потым прыйдуць да палітычных высноў, якія, урэшце, будуць накіраваныя супраць нас») [1, с.131].

Антыкамунізм – другі бок расізму, бо камуністычная ідэалогія грунтуецца на сацыяльнай і нацыянальнай роўнасці і з'яўляецца антыподам фашызму. Менавіта гэтую ісціну імкнецца схаваць па-антысавецку настроеная заходняя прапаганда. Галоўныя пераможцы ў Першай сусветнай вайне – Вялікабрытанія, Францыя і ЗША – імкнуліся ўтрымаць сваё пануючае становішча, а ЗША – і забяспечыць сваё лідэрства ў свеце.

На гэтыя імперыялістычныя мэты наклалася і агульнае імкненне абодвух блокаў знішчыць СССР або яго аслабіць так, каб падпарадкаваць сваім інтарэсам. Авалоданне тэрыторыяй і багаццямі СССР было адначасова і умовай дасягнення сусветнага панавання.

У краінах так званай заходняй дэмакратыі ўзяла верх імкненне выкарыстоўваць фашысцкія дзяржавы супраць СССР і дазволіць за яго кошт свае супярэчнасці з фашысцкім блокам. На думку амерыканскага гісторыка Ф. Шумана, палітыкі Англіі, Францыі і ЗША лічылі, што «прадастаўленне фашысцкай тройцы свабоды рук прывядзе да германа–японскаму нападу на Савецкі Саюз», а іх краіны могуць застацца нейтральнымі пакуль «фашызм і камунізм будуць знішчаць адзін аднаго» [2, p. 91].

22 чэрвеня 1941 г. з вераломнага нападу на Савецкі Саюз гітлераўскай Германіі пачалася Вялікая Айчынная вайна. Заходняя гістарыяграфія, у тым ліку нямецкая, сродкі масавай інфармацыі і кінематограф трактуюць пачатак Вялікай Айчыннай вайны як ланцуг памылак кіраўніцтва і заганаў «сталінскага рэжыму». Памылкі і пралікі былі, і пра іх пісалі вядомыя савецкія палкаводцы ў сваіх успамінах. Але памылкі і пралікі былі і ў французаў і англічан, і яны скончыліся разгромам Францыі і крытычным становішчам Англіі, пераможным маршам гітлераўскай арміі па Еўропе. Пачатковы ж перыяд Вялікай Айчыннай вайны, нягледзячы на катастрафічныя паразы летам 1941 г., завяршыўся разгромам раней «непераможнага» вермахта пад Масквой, што змяніла стратэгічны характар Другой сусветнай вайны.

З першых дзён Вялікая Айчынная вайна прыняла характар усенароднай барацьбы за родную Айчыну, свой край і бацькоўскі дом. Яна закранула інтарэсы ўсіх слаёў грамадства. Можна ў нейкай меры пагадзіцца з тымі, хто сумняваецца ў тым, што ўвесь народ выступіў «як адзін». Адны ішлі змагацца за сацыялізм. Іншыя зусім не думалі пра сацыялізм, а думалі пра Айчыну. Трэція служылі па загадзе. Чацвёртыя чакалі свайго часу і выступілі супраць сваёй краіны, супраць існуючай улады. Уся справа ў суадносінах гэтых «патокаў». Калі акцэнтаваць увагу на апошнім, то складзецца меркаванне, што вайна была не супраць вонкавага ворага, а супраць «таталітарнага рэжыму на чале са Сталіным». Але гэтыя пустыя сцвярджэнні не адпавядаюць рэчаіснасці. На абарону Радзімы ўсталі мільёны, у тым

ліку і маладыя людзі, прычым не па загадзе звыш, як здаецца, аматарам «ісціны», а па закліку сэрца. Гістарычнае значэнне чалавека, лічыў М.Г. Чарнышэўскі, «вымяраецца яго заслугамі радзіме, яго чалавечую годнасць – сілаю яго патрыятызму» [3, с. 67].

Вайна з фашысцкай Германіяй, калі на абарону Радзімы падняліся стары і малы, паказала ўсяму свету нябачаную стойкасць і мужнасць савецкага воіна. Подзвігі абаронцаў Брэсцкай крэпасці-героя, Зоі Касмадзям'янскай, Лізы Чайкінай, Аляксандра Матросава, Юрыя Смірнова, Мікалая Кузняцова і многіх тысяч іншых назаўжды ўвайшлі ў гісторыю СССР, а цяпер постсавецкіх краін. Вялікая Айчынная вайна прадэманстравала нябачаны ўзлёт самасвядомасці грамадзян нашай краіны, якія працавалі ў тыле і забяспечылі фронт усім неабходным. Патрыятызм, дружба народаў шматнацыянальнай краіны з'явіліся важным фактарам у дасягненні перамогі над фашызмам.

СССР стаў галоўнай ваенна-палітычнай сілай, што абумовіла пераможны ход Другой сусветнай вайны, яе гістарычныя вынікі, і ў канчатковым выніку – абарону народаў свету ад прыгнёту фашызмам. Гэта даказваецца наступнымі гістарычнымі фактамі: 1) СССР быў адзінай сілай, якая спыніла пераможнае шэсце фашызму па Еўропе і змяніла стратэгічны характар Другой сусветнай вайны ў бітве пад Масквой. Замест серыі пераможных бліцкрыгаў вайна ператварылася ў працяглую ўзброеную барацьбу; 2) Чырвоная Армія ў разлютаваных бітвах з галоўнай сілай фашысцкага блока, Германіяй, і яе саюзнікамі ў Еўропе дамаглася карэннага пералому ў Другой сусветнай вайне ў 1943 г. на карысць антыфашысцкай кааліцыі (Сталінград, Курск, Кіеў – тры галоўныя бітвы); 3) Савецкі Саюз у 1944–1945 гг. выканаў вызваленчую місію ў большасці краін Еўропы, захаваўшы іх дзяржаўнасць і гістарычна справядлівыя межы; 4) Савецкі Саюз унёс найбольшы ўклад у агульную ўзброеную барацьбу, разграміўшы асноўныя сілы армій фашысцкага блока, абумовіўшы гэтым безумоўную капітуляцыю Германіі і Японіі. Чырвоная армія разграміла 507 нямецка-фашысцкіх і 100 дывізій яе сатэлітаў – у 3,5 разы больш, чым саюзнікі на ўсіх франтах Другой сусветнай вайны. Фашысцкі блок панёс тут 73% усіх людскіх страт і страціў 2/3 усёй ваеннай тэхнікі [4, с. 245].

Працяглая вайна з магутным праціўнікам-Германіяй, якая выкарыстала патэнцыял ўсёй Еўропы, зацягванне адкрыцця другога фронту саюзнікамі абумовілі цяжкія страты савецкага народа. Сёння ўжо дакладна вядомыя лічбы агульных страт: з грамадзянскім насельніцтвам яны склалі 26,6 млн чалавек, з іх 18 млн – мірныя грамадзяне. Страты на фронце – 8 млн 668 тыс. Суадносіны ваенна-аператыўных страт Чырвонай Арміі і яе саюзнікаў з аналагічнымі стратамі Германіі і яе саюзнікаў прыкладна роўныя 1:1, нягледзячы на найцяжэйшыя ўмовы пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Гэта абвяргае здагадкі нядобразычлівцаў савецкага ваеннага мастацтва аб «празмерным кошце перамогі».

Гістарычны працэс няўмольны і незваротны. Мяняюцца пакалення з іх каштоўнасцямі. Ваганні, а тым больш кардынальныя змены палітычнай сітуацыі адлюстроўваюцца на ацэнцы гістарычных падзей. Адной з такіх вялікіх гістарычных падзей і з'яўляецца Вялікая Айчынная вайна савецкага народа супраць фашысцкай Германіі 1941–1945 гг. Сёння гэтая праблема набывае найбольшую актуальнасць і значнасць, бо ў шэрагу еўрапейскіх краін і ў некаторых дзяржавах на постсавецкай прасторы, напрыклад, на Украіне, асабліва ў апошнія гады, часцяком наўмысна скажаюцца або адкрыта фальсіфікуюцца падзеі Вялікай Айчыннай вайны, партызанскага руху і падполля, у негатыўным святле падаюцца подзвігі моладзі ў гады вайны, ўкараняюцца ў свядомасць сучаснай моладзі рознага роду міфы і стэрэатыпы, «новыя каштоўнасці».

Сёння са шкадаваннем даводзіцца канстатаваць, што амаль праз 80 гадоў пасля разгрому германскіх варвараў і іх прыслужнікаў нам, сынам, унукам і праўнукам пераможцаў, даводзіцца абараняць іх праведную ратную працу ўжо на палях інфармацыйнай вайны, адстойваць правую справу стваральнікаў Вялікай Перамогі, перамогі дабра і справядлівасці над сіламі зла і гвалту! Спробы фальсіфікацыі ваеннай гісторыі не слабеюць. Сёння робіцца многае, каб перапісаць гісторыю ва ўгоду палітычным амбіцыям і дзеля падтрымання аднапалярнага свету, пазбавіць народ, які стварыў Вялікую Перамогу, памяці аб гэтай найвялікшай трагедыі. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка першым з лідараў постсавецкіх дзяржаў перасцерагаў і з уласцівай яму шчырасцю адзначаў, што ў нашых народаў хочуць скрасці перамогу, пазбавіць іх права ганарыцца ратным подзвігам пераможцаў.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Широкова, И. Г. История цивилизаций / И. Г. Широкова. – М. : ПРИОР, 2000. – 188 с.
2. Schuman, F. L. Soviet Politics At Home and Abroad / F. L. Schuman. – New York : Alered A. Knop. – 714 p.

3. Чернышевский, Н. Г. Эстетические отношения искусства к действительности / Н. Г. Чернышевский. – М. : Гослитиздат, 1955. – 160 с.
4. Бобылев, П. Н. Великая Отечественная война. Вопросы и ответы / П. Н. Бобылев, С. В. Липицкий. – М. Политиздат, 1984. – 388 с.

*А. Ф. Самусік, кандыдат гістарычных навук, дацэнт*
*БДЭУ, г. Мінск*

# ПАТРЫЯТЫЧНАЕ СВЕТАЎСПРЫМАННЕ Ў АСЯРОДДЗІ ШЛЯХЕТНАЙ МОЛАДЗІ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ У 1770-я – ПАЧАТКУ 1780-х ГАДОЎ

Другая палова XVIII ст. стала тым часам для грамадства Рэчы Паспалітай, калі пад уплывам яе агульнага заняпаду шырыліся патрыятычныя настроі, скіраваныя на жаданні прыкласці ўсе сілы для адраджэння сваёй Радзімы. Асновы такога светаўспрымання былі закладзены піярамі ды езуітамі, якія з 1750-х гг. зрабілі неад’емным элементам арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу ва ўласных школах выпрацоўку ў вучняў актыўнай жыццёвай пазіцыі і пачуцця грамадзянскай адказнасці [1, с. 94–95].

Згодна тагачаснай практыцы дасягалася гэта праз спасылкі на антычную гісторыю, дзе шукаліся прыклады годныя для пераймання. У выніку адпаведныя выданні атрымлівалі выгляд зборнікаў, тэматычна падыходзячых урыўкаў з твораў старажытнагрэчаскіх і старажытнарымскіх аўтараў. Азначаны падыход рабіў магчымым падрыхтоўку падобных павучальных кніг кампілятыўнага характару не толькі прафесійнымі навукоўцамі ці выкладчыкамі, але і ўсімі тымі, каму не была абыякава будучыня Айчыны.

Як след гэтага, няма нічога дзіўнага ў тым, што сярод аўтараў патрыятычных па зместу тагачасных твораў былі і падлеткі са шляхетных сямей, якія адчувалі сваю тоеснасць з дзяржавай, а яе дабрабыт лічыўся імі вышэйшым прыярытэтам уласнага жыцця. Выдатнай праявай такога светаўспрымання ў асяроддзі моладзі стаў зборнік маралізатарскіх тэкстаў антычных аўтараў, перакладзены на польскую мову 16-гадовай Кунегундай і яе 14-гадовым братам Вінцэнтам Камароўскімі. Іх бацька гр. Й. Камароўскі быў кашталянам Бельска, размешчанага паміж Брэстам ды Беластокам, а самі дзеці атрымалі хатнюю адукацыю пад наглядам члена піярскага ордэну матэматыка А.С. Устшыцкага [2, с. 434–435].

Кніга, падрыхтаваная маладымі Камароўскімі мела назву: “Выбраныя апавяданні старажытных свецкіх пісьменнікаў з меркаваннямі і высновамі мудрацоў аб чалавечых абавязках” (Варшава, 1779) ды фактычна ўяўляла сабою дапаможнік па этыцы. Складалася яна з двух частак – малодшы Вінцэнт у другой з іх выпісаў з Цыцэрона ўрыўкі, распавядаючыя аб розных праявах чалавечага характару (імкненне да славы, гнеў, ліслівасць), занятках (музыка, гульні) і г.д. У той жа час, Кунегунда прааналізавала ў першай частцы больш шырокі спектр антычных аўтараў з мэтай вывучэння іх поглядаў на маральныя паводзіны, дасягненне ўсеагульнай справядлівасці, разважлівасці ва ўчынках [3, с. 99].

Шмат увагі дзяўчына ўдзяліла якраз тэме патрыятызма. Так, XXIX раздзел называўся “Паўсюдна ўсіх любоў да Айчыны аб’ядноўвае”.  Тут яна адзначала, што ступень разумення ўласных абавязкаў перад грамадствам у людзей адрозніваецца – некаторыя клапацяцца аб “Айчыне і Бацьках, якім найвялікшымі дабрачыннасцямі абавязаны”, іншыя ж перад усім ставяць уласных дзяцей і дом. Аднак, усіх звязвае разам стаўленне да Рэчы Паспалітай: “Мілей за Бацькоў, мілей дзяцей, сваякоў, прыяцеляў, толькі ўсе шматлікія любові адна Айчына ў сабе заключае, за якую некаторыя і смерць гатовы прыняць…”. Далее яна піша: “Жыцця бег кароткі… усім прызначана смерць… дык лепш жыццё Айчыне ахвяраваць… Я нават бессмяротнасць не жадала бы прыняць насуперак Айчыне, бо заўсёды лічыла: што тыя, хто за Рэч Паспалітую жыццё паклалі, не смерць, а хутчэй бессмяротнасць атрымалі”. Ідэямі ўсеагульнай роўнасці прасякнуты яе разважанні наконт таго, што: “Калі б былі Афрыканіны згодныя абараняць Рэч Паспалітую, упэўнена ў тым, што ўсе, хто Айчыну ахоўваў, выратоўваў, пашыраў, напэўна на Нябёсах у прызначаным месцы знаходзяцца і вечнае шчасце спажываюць” [4, с. 142–143].

Наступны XXX раздзел у якасці назвы ўтрымліваў цытату з Гарацыя: “Салодка і пачэсна за Айчыну паміраць”. Тут прыводзіцца аповяд Валерыя аб вайне афінян з дарыйцамі. Афінскі цар Кодр звярнуўся да Апалона Дэльфійскага з пытаннем, як спыніць гэтую няўдалую для яго вайну. Адказ